Слова пісьменніка

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




У кожнага ўніверсітэта ёсць нейкая адметная рыса, як цяпер прынята гаварыць, свая фішка. У Віцебскага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава — гэта мастацка-графічны факультэт. Знакаміты «худграф». Мастацкія традыцыі Віцебска даўнія і ўсяму свету вядомыя. Там займаліся творчасцю Юдэль Пэн, Марк Шагал, Казімір Малевіч. «Худграф» — гадаванец рэктара Віцебскага педінстытута (пасля ўніверсітэта), выдатнага вучонага ў галіне начартальнай геаметрыі і тэхнічнай графікі, доктара педагагічных навук, прафесара Віктара Ніканавіча Вінаградава. Ён быў там рэктарам з 1978 да 1997 года. Мне не давялося пазнаёміцца з Вінаградавым бліжэй, але пра яго, пра каларыт гэтай асобы шмат расказвалі рэктары, калегі і сябры. У прыватнасці, падрабязна і з любоўю блізкія мне па жыцці выпускнікі «Вінаградаўскага» «худграфа» — дацэнт майго Магілёўскага ўніверсітэта Мікалай Іванавіч Касабуцкі, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Іванавіч Пракапцоў і міністр інфармацыі Уладзімір Барысавіч Пярцоў.

Пасля Віктара Ніканавіча Віцебскі ўніверсітэт узначаліў доктар гістарычных навук, прафесар Аркадзь Уладзіміравіч Русецкі. З Аркадзем Уладзіміравічам мы пасябравалі, калі я ўжо працаваў рэктарам. Нашы ўніверсітэты былі падобныя і па задачах, і па дасягненнях, і па праблемах, таму мы часта з ім перазвоньваліся, сустракаліся, раіліся, «шапталіся». Аднойчы разам са сваімі жонкамі ў адзін час адпачывалі ў Сочы, у санаторыі «Беларусь». Я, зразумела, болей яго слухаў. і было што! Базавая адукацыя — факультэт філасофіі БДУ, кандыдат філасофскіх навук, а пасля — сакратар, другі сакратар, першы сакратар Віцебскага гаркама КПБ, загадчык ідэалагічнага аддзела, сакратар па ідэалогіі ЦК КПБ. А пасля яшчэ і першы намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама. У навуковым асяроддзі Русецкага ведалі і паважалі як даследчыка сучаснай мастацкай культуры Беларусі. Мне з Аркадзем Уладзіміравічам заўсёды было цікава, Віцебскі ўніверсітэт ён любіў і стараўся ў няпростыя перабудовачныя часіны максімальна дадаць яму ў развіцці. У яго было неверагоднае пачуццё гумару. Неяк звоніць мне ў Мінск:

— У цябе ёсць хто-небудзь у танкістаў?

Я не разумею, пра што ён гаворыць. Навошта цікавіцца арміяй, танкавымі войскамі і праз мяне жадае ўсталяваць там нейкія знаёмствы. Маўчу. А ён прагаве:

— Мой сын у танкістаў абараняе кандыдацкую дысертацыю, і яны спрабуюць наладзіць яму замарочкі.

І тут я сцяміў, што ён мае на ўвазе педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка. Я пасля яго рэктара Пятра Дзмітрыевіча Кухарчыка часам так і называў — «галоўны танкіст».

Магчыма, я памыляюся, але мне бачылася, што Аркадзю Уладзіміравічу на пасадзе рэктара было цесна. Гэта пачуццё не пакідала мяне і пасля прызначэння міністрам, я заўважыў, што і адносіны нашы ў гэты час сталі прахалоднымі. Вярнуўся яшчэ раз да думкі, што болей лагічна з пасады рэктара станавіцца міністрам, сакратаром ЦК, а не наадварот.

У адстаўку Русецкі сышоў па ўзросце, цалкам прысвяціўшы сябе навуковай працы. На яго месца Аляксандр Мікалаевіч Касінец, тады віцэ-прэм'ер, прапанаваў прарэктара па навуковай рабоце, доктара медыцынскіх навук, прафесара Аляксандра Пятровіча Саладкова. З медыцынскай сферы, як правіла, не сыходзяць, яна вельмі паглыбляе ў сябе, там шмат спецыфікі — я засумняваўся ў правільнасці такога рашэння, але Аляксандр Пятровіч на пераход пагадзіўся. І стаў вельмі добрым рэктарам. Яго прыняў калектыў, ён прыўнёс у вучэбны працэс універсітэта традыцыі медыцынскай адукацыі, у рэгіёне набыў аўтарытэт пераканаўчага палітыка, Шкада, заўчасна трагічна загінуў...

Пасля Аляксандра Пятровіча Віцебскім універсітэтам зусім нядоўга кіраваў дацэнт Васіль Васільевіч Маліноўскі, пасля, да выбрання ў Савет Рэспублікі, доктар юрыдычных навук, прафесар Аляксей Уладзіміравіч Ягораў, цяпер там працуе рэктарам доктар эканамічных навук, прафесар Валянціна Васільеўна Багатырова.

Віцебскі тэхналагічны ўніверсітэт па сваім прызначэнні ў Беларусі ўнікальны. Ён рыхтуе спецыялістаў для добра развітой у краіне лёгкай прамысловасці: ад тэкстыльных вытворчасцяў да шыцця адзення, ад інжынераў і тэхнолагаў да дызайнераў. Таму і вучэбны працэс у гэтай ВНУ даволі своеасаблівы, толькі памяшканнямі для лекцый і семінараў не абысціся, патрабуюцца лабараторыі, вучэбныя вытворчасці, ды яшчэ і творчыя майстэрні, выставачныя галерэі.

З рэктарам Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта, доктарам тэхнічных навук, прафесарам Валерыем Сцяпанавічам Башметавым я пазнаёміўся на курсах павышэння кваліфікацыі рэктараў і першых прарэктараў у 1995 годзе, у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы. Ён прыглянуўся мне перш за ўсё сваёй арганізаванасцю, непадробнай зацікаўленасцю да вучэбных заняткаў і адкрытым характарам. Вось з таго часу мы і трымаемся адзін аднаго. Валерый Сцяпанавіч вядомы ў краіне вучоны ў галіне тэхналогій ткацкай вытворчасці, але ён з тых вучоных-практыкаў, ад якіх можна атрымаць і карысныя ў паўсядзённым жыцці парады. Яшчэ на тых курсах у РІВШы ён мне раіў:

— Не замаўляй сабе касцюмы ў атэлье, купляй пашытыя на фабрыцы. Толькі там будзе вытрымлівацца поўная тэхналогія — патрэбная падкладка, конскія валасы ў тканіне для ўстойлівасці формы, правільнае для кожнай дэталі шво.

Валерыю Сцяпанавічу ў спадчыну ад папярэднікаў і цяжкіх дзевяностых засталіся недабудаваныя будынкі вучэбнага корпуса і вучэбнай вытворчасці. Аб'ём будаўніцтва чакаўся вялікі, і рэктар прыехаў да мяне са сваімі прапановамі па яго завяршэнні. Ён дамовіўся пра падтрымку аб фінансаванні работ з губернатарам Віцебскай вобласці Уладзімірам Паўлавічам Андрэйчанкам, назбіраў крыху сваіх пазабюджэтных сродкаў, але, безумоўна, асноўных укладанняў прасіў у міністра. Я разумеў, што пытанне ўмацавання матэрыяльнай базы тэхналагічнага ўніверсітэта актуальнае для краіны не толькі ў эканамічным, але і ў палітычным аспекце — ткацкія і пашывачныя вытворчасці ізноў набіралі сілу, а гэта не толькі прыбыткі ў казну, але і занятасць насельніцтва, рабочыя месцы, пры гэтым перш за ўсё для жанчын. Здольнасці Валерыя Сцяпанавіча грунтоўна прадумваць маштабныя планы, узяць на сябе адказнасць за іх рэалізацыю я ведаў, таму падтрымаў яго рэктарскія ініцыятывы.

Зусім няпроста нам з ім давялося з гэтымі будоўлямі. Грошай пастаянна не хапала, былі праблемы з будаўнікамі — яны ўсім былі патрэбны і таму маглі выбіраць найболей выгадныя для сябе аб'екты. Мы з рэктарамі, а сярод іх — і былыя члены ўрада, такія вопытныя і мудрыя, як, напрыклад, прафесар Шымаў, у гэтых умовах уважліва сачылі за практыкай і асаблівасцямі работы Міністэрства фінансаў. Мы, у прыватнасці, заўважылі, што міністр фінансаў Мікалай Пятровіч Корбут штогод практыкаваў адну і тую самую фінансавую аперацыю — 28 снежня абвяшчаў аб прафіцыце бюджэту і прапаноўваў грошы на аплату рахункаў, якія меліся ў арганізацыях. Але банкам ў бягучым годзе заставалася працаваць усяго два дні. Рызыкаваць з аплатай рахункаў да канца года? А раптам прафіцыту не здарыцца? Ды і паспрабуй у перадначавагоднім ажыятажы прымудрыцца аформіць і правесці праз банк неабходныя фінансавыя аперацыі. Мікалай Пятровіч на гэта і разлічваў. Мала хто з кіраўнікоў у гэтай сітуацыі рызыкаваў, міністр праводзіў сэканомленыя ім такім чынам грошы ў бюджэт наступнага года, а нас усіх, не сароменючыся, лаяў за неразваротлівасць.

Тады мы з рэктарамі дамовіліся некаторыя падрыхтаваныя да аплаты рахункі трымаць у сябе да апошняга, а пасля аб'явы прафіцыту іх адразу ж прад'яўляць да аплаты. А калі прафіцыту не здарыцца, аплаціць іх з пазабюджэтных сродкаў. Таксама рызыка — фінансавая дысцыпліна строгая, да канца года трэба ўсе аперацыі з грашыма завяршыць. І на падобныя дзеянні рэктар можа пайсці, калі ў яго ёсць пазабюджэтныя сродкі! Башметаў рызыкнуў, пайшоў. І вось карціна ў прыёмнай міністра адукацыі 3 студзеня. Мне гаворыць сакратарка, што да мяне на прыём прыехаў рэктар Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта. Выходжу яго сустракаць, а ён стаіць у паклоне, узносячы рукі:

— Аляксандр Міхайлавіч, атрымалася! Мы з прафіцытных грошай аплацілі рахункі на чатыры мільярды! У гэтым годзе завяршым будаўніцтва вучэбнага корпуса!

Рэктар пабудаваў вучэбны корпус, адрамантаваў і дабудаваў вучэбна-вытворчыя цэхі. Універсітэт заўважна пашырыў свае магчымасці ў навуковых вышуках, у адкрыцці новых спецыяльнасцяў для лёгкай прамысловасці, болей наблізіўся да вытворчай сферы.

Такія асобы, як Валерый Сцяпанавіч, не могуць заставацца ўбаку ад палітычнай дзейнасці. Людзі жадаюць, каб стратэгічныя пытанні развіцця рэгіёна, увогуле грамадства і дзяржавы для іх вырашалі людзі аўтарытэтныя, якія па жыцці зарэкамендавалі сябе як разумныя і рэзультатыўныя кіраўнікі. Таму рэктара Башметава неаднаразова выбіралі ў Віцебскі абласны савет дэпутатаў, ён быў і членам Савета Рэспублікі, а пасля ўзначальваў абласную арганізацыю «Белай Русі». І на гэтай палітычнай рабоце быў прыкметны — усё такі ж дзелавіты і рэзультатыўны. З рэктарскай пасады сышоў па ўзросце, кіраўніцтва ўніверсітэтам перадаў доктару тэхнічных навук, прафесару Андрэю Аляксандравічу Кузняцову.

Прафесар Башметаў сябраваў з лаўрэатам Нобелеўскай прэміі акадэмікам Алфёравым. Жарэс Іванавіч нарадзіўся ў Віцебску, любіў гэты горад, часта там бываў і нават спыняўся ў інтэрнаце Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта. Валерый Сцяпанавіч у гэтых паездках яго заўсёды суправаджаў. Акадэмік Алфёраў — чалавек знакаміты, яму рады былі ўсе і паўсюль, але ў Віцебск ён ехаў да рэктара Башметава.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8, 15, 22 кастрычніка.)*

*(Працяг будзе 5 лістапада).*